Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

15 КРАСАВІКА 2008 г.
АЎТОРАК
№ 71 (26184)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«Прамая лінія»

БОЛЬ У СУСТАВАХ. АД ЧАГО?

На «прамую лінію» «Звязды» мы запрасілі **загадчыцу неўралагічнага аддзялення Медыцынскага цэнтра МТЗ, кандыдата медыцынскіх навук Святлану Яўгенаўну РОЎДА.** Дарэчы, наша госця ў сваёй медыцынскай практыцы выкарыстоўвае і такі нетрадыцыйны метад, як апітэрапія — лячэнне з дапамогай прадуктаў пчалярства. Пры гэтым дасягаецца даволі паспяховы эфект у лячэнні захворванняў касцёва-мышачнай і перыферычнай нервовай сістэм, сардэчна-сасудзістых паталогій.

«Прамая лінія» адбудзецца 22 красавіка ў аўторак з 16.00 да 17.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).

«Прамая лінія» па вашых просьбах!

ЗАБЫТАЕ? НОВАЕ? ВЕЧНАЕ!

На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, адкажуць падчас «прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

«Прамая лінія» пройдзе 24 красавіка з 15.30 да 17.00. Тэлефануйце ў рэдакцыю па нумарах: 292 38 92; 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03)

Рэха публікацыі

На заўвагу адносна дэбюракратызацыі адказалі... са спазненнем

У нумары «Звязды» ад 28 лютага ў публікацыі-апытанні чытачоў адносна працэсаў дэбюракратызацыі пенсіянер з вёскі Данілавічы Дзятлаўскага раёна Іосіф Касіло выказаў свае нараканні па азначанай тэме.

— У нас тут праблема на 14 сем'яў — з вадой. Летась прарвала водаправод: раз, другі. Адрамантавалі яго таксама раз, другі. А потым... Камунальнікі сказалі паставіць лічыльнікі. Паставілі, а вады ўсё роўна няма. Звярталіся ў сельскі Савет, прыязджаў да нас нейкі начальнік з райвыканкама, абяцаў нешта, ды што з таго? — цытуем мы заяўніка.

У той жа дзень, калі скарга была апублікавана (28 лютага), яна была накіравана рэдакцыяй на рэагаванне ў Дзятлаўскі райвыканкам. Афіцыйны адказ мы атрымалі... 10 красавіка. Як бачна, са значным спазненнем ад вызначаных заканадаўствам тэрмінаў (згодна з імі, рэагаванне павінна было паступіць у рэдакцыю да 28 сакавіка). Магчыма, выкладзеная чытачом праблема запатрабавала дадатковага часу, каб больш дасканала разабрацца ў сітуацыі і выправіць хібы? Магчыма, узнікла неабходнасць у прыцягненні нейкіх іншых бакоў для вырашэння пастаўленага пытання? Ну, тэхніка якая спецыяльная, матэрыялы ці работнікі пэўнай спецыяльнасці?.. Мяркуйце самі.

«Па пытанні рамонту водаправода ў вёсцы Данілавічы Дзятлаўскі раённы выканаўчы камітэт тлумачыць, што дадзены водаправод знаходзіцца на балансе і абслугоўванні СВК «Граніт-Агра». Прызначэнне дадзенага водаправода — для водазабеспячэння жывёлагадоўчай фермы. З-за працяглай эксплуатацыі водаправод выйшаў са строю, таму прынята рашэнне аб пракладцы новага водаправода сіламі раённага ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў тэрмін да 1 кастрычніка 2008 года». Як вы думаеце, варты гэты адказ таго тэрміну, на працягу якога рэдакцыя (ды і самі заяўнікі ў першую чаргу) яго чакала?.. Бадай, варта толькі яшчэ раз нагадаць, якім было адно з пытанняў падчас таго лютаўскага апытання: ці сутыкаліся чытачы апошнім часам з фактамі бюракратызму...

Сяргей РАСОЛЬКА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

повторно проводит открытый аукцион по продаже изолированного помещения (помещения столовой), общей площадью — 2576,3 кв.м, расположенного по адресу: Солигорский район, Метявичское шоссе, 5. Начальная цена с НДС — 560 160 644 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.03.2008 г. Объект продается с условием ремонта фасада помещения столовой в срок до 01.07.2008 г. Аукцион состоится 23 апреля 2008 г. в 15.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Заслонова, 58, к. 510 (зал заседаний). Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22 апреля 2008 г. до 17.00 **по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ЧУП «Слуцкая автомобильная школа» ДОСААФ (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже зданий, расположенных в п. Безверховичи Слуцкого района, в том числе: **Лот № 1:** АЗС, служебное помещение заправочного пункта, (общ. пл. 69,3 кв.м). Начальная цена с НДС — 25 894 534 бел. руб. Площадь земельного участка 0, 1182 га. **Лот № 2:** здание учебного корпуса со смотровой вышкой (общ. пл. 204,2 кв.м). Начальная цена с НДС – 51 393 065 бел. рублей. Площадь земельного участка 0,0523 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 дней со дня подписания договора купли-продажи. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 20 мая 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19 мая 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

НАРАДЖЭННЕ СТВАЛА

Кожная сёмая тона калійнай руды ў свеце здабываецца ў нашай краіне. Для дзяржавы гэтая сыравіна — і выгаднае фінансавая крыніца (23 працэнты бюджэту Міншчыны, напрыклад, фарміруецца на салігорскіх рудніках), і адзін з тых брэндаў, які фарміруе імідж Беларусі на планеце. На сусветным рынку калійныя ўгнаенні растуць у кошце няўхільна. Намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахіма» Міхаіл Асіпенка гарантуе, што да 2009 года мы будзем прадаваць іх на экспарт па 1000 даляраў за тону. Таму прадпрыемства «Беларускалій» зацікаўленае ў распрацоўцы новых месцаў здабычы калійнай руды. Так, днямі на салігорскім Бярозаўскім рудніку пачалі пракладваць шахтныя ствалы.

Адсюль пачынаецца доўгі шлях углыб да карысных выкапняў.

Праходку ствала вядзе брыгада Віктара БІНКЕВІЧА.

У час урачыстага адкрыцця праходкі новага ствала.

Простымі словамі, шахтны ствол — гэта велізарны калодзеж, толькі з яго глыбіні будзе здабывацца не вада, а (амаль у рыфму) — калійная руда. Глыбіня аднаго такога ствала, які на сёння ўжо пракапаны больш чым на дзесяць метраў углыбіню, павінна скласці 650 метраў. Работы працягнуцца да 2012 года, менавіта з гэтага часу на тэрыторыі Чацвёртага рудаўпраўлення пачне функцыянаваць Бярозаўскі ўчастак, які будзе «прыносіць» па 6—7 мільёнаў новых тон руды ў год. Адтуль яна будзе трапляць на першую ўзбагачальную фабрыку па самым працяглым канвееры, які таксама цяпер будуецца, — яго даўжыня складзе 11,5 кіламетра, і частка пройдзе над вадасховішчам.

Дарэчы, на глыбіні прыблізна 160 метраў вада таксама абавязкова сустрэнецца. Але для шахцёраў яна зусім не пажаданая — затопіць усё, ды і для руды шкодная. Ёсць спецыяльныя тэхналогіі і рэчывы, каб замарозіць падземныя воды. І хоць капаюць шахты ствол таксама, як і здаўна — механічным каўшом чэрпаюць зямлю, насыпаюць яе ў будаўнічую бодню, а калі тая запоўніцца, яе падымаюць на паверхню і высыпаюць. Нічога больш эфектыўнага яшчэ не прыдумана. Працуюць брыгады ў тры змены, працэс няспынны. Тэхналогія асваення новага, багатага рудой месца ўжо прызнана ўнікальнай.

— Упершыню, напэўна, у свеце мы адначасова вядзём пракладку ствалоў — вертыкальна ўглыбіню, і паралельна «ідзём» пад зямлёй па гарызонце, таксама да радовішча руды. Да таго часу, як правядзём шахтныя ствалы, пад зямлёй усё будзе падрыхтавана да здабычы. Таму, калі звычайна ў практыцы розных краін руднік будуецца 10—12 гадоў, мы узвядзём яго за шэсць з паловай гадоў, — тлумачыць генеральны дырэктар «Беларускалія» Андрэй Башура. — Запасы руды ў некаторых нашых шахтах з цягам часу вычэрпваюцца, таму мы і ствараем новыя месцы здабычы. Па ацэнках, на Бярозаўскім рудніку запасаў хопіць на 45 гадоў.

Праект каштуе 850 мільярдаў рублёў, аднак гэтыя грошы выдаткаваныя з разлікам на перспектыву, таму акупяцца і прынясуць у разы больш сродкаў. «Для Мінскай вобласці прадпрыемства не проста важнае, а суперважнае. Таму мы зацікаўленыя ў яго далейшым развіцці і поспеху. Праца шахцёра вельмі небяспечная, складаная, цяжкая... Я выказваю шахцёрам самую глыбокую падзяку», — падкрэсліў старшыня Мінскага аблвыканкама Леанід Крупец.

Дзмітрый АЛЬФЕР.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Героі сярод нас

ЗАКРЫЎ САБОЙ

Гібель многіх людзей, удзельнікаў хрэснага ходу, несумненна, папярэдзіў 36-гадовы інспектар Дзяржаўтаінспекцыі Брэста. У другой палове дня ў нядзелю з горада над Бугам рушыў хрэсны ход у гонар аб'яднання Праваслаўнай царквы. Яго здзяйсняюць усяго 200 чалавек. Праваслаўныя беларусы пройдуць цераз усю рэспубліку і аб'яднаюцца з іншымі ўдзельнікамі мерапрыемства ў Бранску.

Каля 15 гадзін вернікі вырашылі зрабіць прыпынак у раёне Булькоўскага маста. Пры гэтым, першыя ўжо спыніліся, а тыя, што замыкалі калону, яшчэ рухаліся. Працэсію ззаду суправаджаў аўтамабіль ДАІ. У нейкі момант міліцыянер у люстэрка заўважыў іншамарку, якая імчала на поўнай хуткасці. На роздум былі долі секунды, і міліцыянер загарадзіў дарогу парушальніку сваім аўтамабілем. Можна толькі ўявіць, колькі было б ахвяраў, каб гэтага не здарылася. Аўтаінспектар атрымаў закрытую чэрапна-мазгавую траўму, вадзіцель «Форда» і яго пасажырка не пацярпелі.

Яна СВЕТАВА.

З рэдакцыйнай пошты

НОВАЯ «БЕЛАРУСКАЯ МОДА»?

Шаноўная рэдакцыя! З той прычыны, што «Звязда» з'яўляецца адзінай (не пішу апошняй) штодзённай беларускай газетай, яна, у пэўнай ступені, задае тон у сучаснай беларускай пісьмовай мове. І таму трэба быць вельмі пільнымі ў выкарыстанні мовы на сваіх старонках. Бо гэтая мова нам Богам дадзена, дык ці варта яе засмечваць? Калі ў нашай мове няма якога слова для азначэння новага прадмета або паняцця, то можна скарыстаць іншамоўнае. Але якое апраўданне чалавеку, каторы беларускія словы замяняе іншаземнымі? Гэта, мусіць, пастаянная праблема для многіх моў, а найбольш для беларускай, якая ўсё менш выкарыстоўваецца ў СМІ.

Я некалі пісаў пра заняхайванне беларускіх слоў «знячэўку», «заміж», «заўсёды», «зразу» і пра замену іх пазычанымі «знянацку», «замест», «заўжды», «адразу». Не падабаецца мне гэтая «беларуская мода» замяняць сваё чужым, нібыта лепшым. У часы Вялікага княства Літоўскага ў канцылярскую беларускую мову ўносілі ўсё больш і больш польскіх слоў, пакуль гэту «мову» зусім не адрынулі і не перайшлі поўнасцю на польскую. У часы БССР беларускую мову (афіцыйную) усё больш напаўнялі русізмамі, пакуль, амаль скрозь, не перайшлі на рускую. Пайшла новая «мода» — украінізмы. Гэта тым больш небяспечна, што беларуская і ўкраінская мовы даволі блізкія. Пісаў раней пра ўкраінізм «заўжды». Цяпер пра таксама ўкраінізмы, якія на кожнай старонцы, ці не ў кожным артыкуле разы па 4 можна сустрэць — «згадаць», «нагадаць», «прыгадаць» і нават «узгадаць». Чым яны такія «смачныя»? Што здаюцца больш беларускімі, хоць зусім такімі і не з'яўляюцца? А дзе ж нашы словы «напомніць, успомніць, прыпомніць»?! От яны якраз і з'яўляюцца беларускімі. Возьмем «Слоўнік беларускіх гаворак Паўночна-Заходняй Беларусі» (фундаментальнае выданне ў 5 тамах, у якім змешчана лексіка з Гродзеншчыны, Віленшчыны, Міншчыны, Брэстчыны, Віцебшчыны і нават Гомельшчыны). Дык вось, там увогуле не адзначаны словы «узгадаць» і «прыгадаць», якія гэтак часта застракацелі на старонках газет, кніг і ў мове дыктараў радыё. А слова «згадаць» мае зусім іншыя значэнні — «пагаварыць і адгадаць». Слова «нагадаць» запісана ў Іўеўскім раёне і азначае «задумваць». А слова «прыгадваць» значыць «гаварыць або лічыць»!

Прывяду цытату з нашага выдатнага моўназнаўцы К. Крапівы (артыкул «Ці будзем мы ездзіць па левым баку?»). Ён піша: «У сілу той жа недарэчнай тэндэнцыі выкасоўваюцца словы — успомніць, напомніць, напамяніць і замяняюцца словамі — згадаць, прыгадаць, нагадаць у той час, як першыя з даўніх часоў з'яўляюцца пашыранымі ў беларускай мове, а другія — вузкадыялектныя і нават у мясцовых гаворках рэдка сустракаюцца. У слоўнікі яны трапілі з кніг і даюцца звычайна з пэўнымі стылістычнымі паметамі, але ў некаторых рэдакцыях зразу сталі фаварытамі». Дадам яшчэ, што і сэнс жа гэтых слоў іншы! Дык чаму тады ці не кожны аўтар «варожыць» — згадвае, нагадвае, прыгадвае? Каму і што нагадаюць (наварожаць) яны? Трэба адмовіцца ад гэтай заганнай схільнасці лічыць чужое сваім, а сваё адкідаць. Трэба каб мова наша, якую лічылі самай чыстай славянскай, і папраўдзе была чыстай і ў вуснах людзей, і на старонках газет і другіх сродкаў масавай інфармацыі.

Аляксей БРУЙ.
г. п. Гарадзея Нясвіжскага раёна.

ГРОДЗЕНСКІМ ДЗЕЦЯМ З МАЛАМАЁМНЫХ СЕМ'ЯЎ БЯСПЛАТНА ВЫДАЮЦЦА МАЛАКО, СОКІ І КАНСЕРВЫ

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта Аляксандр Антоненка. Такая магчымасць прадастаўляецца сем'ям, дзе сярэдні даход на чалавека не перасягае 60 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму. Разлічваецца гэты паказчык зыходзячы з даходаў за паўгоддзе, што папярэднічае моманту звароту. Акрамя зарплаты ў даход уключаюцца дапамога на дзіця, усе віды стыпендый і льготаў. Бясплатнае харчаванне не прызначаецца у тым выпадку, калі дзеці жывуць у інтэрнаце, дашкольнай установе з кругласутачным знаходжаннем або калі ад дзіцяці адмаўляюцца бацькі.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 **85 ЛЕТ**

ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК» СООБЩАЕТ,

что с 15 апреля 2008 года учреждения банка начинают производить выдачу жителям республики новых видов кредитов «ЗДОРОВЬЕ» И «АГРОТУРИСТ»

Кредит **«Здоровье»** предоставляется для приобретения спортивных домашних тренажеров, детских спортивных комплексов, спортивного инвентаря и экипировки.

Выдача кредитов **«Здоровье»** производится в белорусских рублях и в иностранной валюте на срок до двух лет с уплатой за пользование кредитом в белорусских рублях **14 %** годовых, в иностранной валюте — **12 %** годовых (для граждан, постоянно проживающих и работающих в сельских населенных пунктах: в белорусских рублях — **13 %** годовых, в иностранной валюте — **11 %** годовых).

Кредит **«Агротурист»** предоставляется для приобретения туристических путевок для отдыха в сельских усадьбах — объектах агроэкотуризма. Кредит **«Агротурист»** предоставляется сроком до одного года с уплатой за пользование кредитом в белорусских рублях процентной ставки в размере **12 %** годовых, в иностранной валюте — **10 %** годовых.

Кредиты **«Здоровье» и «Агротурист»** предоставляются как безналичным путем, так и наличными деньгами.

Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» **или на веб-сайте банка www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Рассакрэчаны архіў

«ВЫШКА» ЗА ВАЛЮТУ

Валютчыкаў асудзілі ў агульнай складанасці на больш як 150 гадоў зняволення, а чацвёра атрымалі вышэйшую меру пакарання. Гэта была самая буйная падобная справа ў гісторыі Беларусі.

...Два тыдні ў клубе імя Ф.Э. Дзяржынскага ішоў паказальны працэс па гучнай крымінальнай справе — судзілі валютчыкаў, якія незаконным шляхам зарабілі мільённае багацце. На лаве падсудных — 18 чалавек. Зала клуба — поўная гледачоў, простых людзей, якія заходзілі паглядзець на працэс пасля цяжкага працоўнага дня. Такая незвычайная па сённяшніх мерках цікавасць да «валютнага працэсу» тлумачыцца адным: гэта быў 1962 год. А годам раней група валютчыкаў, якая пражывала ў Мінску і спекулявала валютай у вялікіх памерах, трапіла ў поле зроку Камітэта дзяржбяспекі...

Сціплы, ціхі шавец Міхаіл Бурсак працуе на фабрыцы «Рэмабутак». Ніхто не здагадваецца, якім багаццем валодае гэты звычайны рабочы чалавек. Падчас вобыску супрацоўнікі КДБ знайшлі ў яго доме 1800 залатых рублёў царскай чаканкі, 16 ашчадных кніжак па 10 тысяч рублёў на кожнай, 42 ашчадныя кніжкі на прад'яўніка...

(Заканчэнне на 3-й стар.)

РАСІЯ ЧАСОВА АДМЯНІЛА АФАРМЛЕННЕ ЎВОЗУ ЛЕГКАВОГА ТРАНСПАРТУ НА БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЙ ГРАНІЦЫ НА ТРАСЕ Е-30

Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей Барысюк.

Намеснік старшыні ДМК праінфармаваў, што ў вадзіцеляў легкавых транспартных сродкаў, якія будуць вяртацца ў Беларусь па дарозе Е-30, праблем у Расіі ў сувязі з адсутнасцю пасведчання часовага ўвозу не ўзнікне. «Аднак тым, хто будзе вяртацца па іншых дарогах, я настойліва рэкамендую аформіць часовы ўвоз», — сказаў ён.

БЕЛТА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

16 красавіка 2008 г. у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу дзесятая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08071>

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.04.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	3 387,17
1 латвійскі лат	4 858,44
1 літоўскі літ	981,00
1 чэшская крона	136,03
1 польскі злоты	987,14
1 расійскі рубель	91,22
1 украінская грыўня	432,59

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	23,5139
10 UAH	46,7641
1000 BYR	10,9513
EUR	37,0603
Курс у гандлёвых кампаніях (на 14.04.2008 г.)	
USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ДРАГРЭЙСІНГ ПА-БЕЛАРУСКУ

У суботу, 12 красавіка, на аэрадроме ў горадзе Быхаў Магілёўскай вобласці адбылося чарговае адкрыццё першага этапа чэмпіянату Беларусі па драгрэйсінгу.

Каля трыццаці ўдзельнікаў не толькі з усіх куткоў Беларусі, але і гасцей з Украіны спаборнічалі ў заездах, удзельнічалі ў выставе цюнінгованных аўтамабіляў на званне «самай пракачанай тачкі».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Абзац

■ Памер арэндной платы за гандлёвыя месцы ў будынках дзяржуласнасці будзе павышаны. Гэта адбудзецца ў сувязі з уступленнем у сілу з 23 красавіка гэтага года ўказа Прэзідэнта Беларусі ад 23 кастрычніка 2007 года № 533.

■ **Беларусь будзе гаспадыняй чэмпіянату Еўропы-2010 па цяжкай атлетыцы. Такое рашэнне аднагалосна было прынята на кангрэсе Еўрапейскай федэрацыі цяжкай атлетыкі (EWF), які адбыўся ў Італіі.**

■ Першы ў Гродзенскай вобласці Летні амфітэатр пабудуюць у Смаргоні. Амфітэатр з глядзельнай ложай на 500 месцаў будзе ўзведзены ў гарадскім парку. Зацверджаны праект прадугледжвае выкарыстанне магчымасцяў прыроднага ландшафту: сцэна размесціцца на адным беразе рэчкі Оксна, глядзельная ложа — на другім. У адзіны комплекс іх аб'яднаюць ажурныя масткі праз раку. Узвядзенне амфітэатра будзе на сродкі за кошт раённай казны. Кошт будаўніцтва — Br500 млн.

■ **Беларусь імпартуе ў 2008 годзе 1,5 млн тон цэменту з Заходняй Еўропы. Імпартуемы цэмент будзе прадавацца ў Беларусі па адзінай адпускной цане, уведзенай з 1 красавіка гэтага года. Напрыклад, кошт гэтага будматэрыялу маркі 500-Д0 складае цяпер амаль $123 за 1 тону.**

■ Міжнародная выстаўка раскошы будзе праходзіць у Мінску ў канцы мая. Прадметы раскошы і паслугі класа «люкс» у такім фармаце ў Беларусі будуць прадстаўленыя ўпершыню. Падчас выстаўкі запланаваныя дзённыя і вячэрнія закрытыя раўты, удзельнікамі якіх стануць прадстаўнікі культурнай і бізнэс-эліты з Беларусі і краін далёкага замежжа.

■ **За тры месяцы сёлета спецыялісты Дзяржаўнай архіўнай службы атрымалі каля 200 запытаў ад грамадзян, якія пажадалі даведацца пра сваё генеалагічнае дрэва. Сваёй радаслоўнай зацікавіліся 101 замежны грамадзянін і 77 беларусаў. Летась гэтыя лічбы былі адпаведна 86 замежнікаў і 39 нашых суайчыннікаў. Усяго летась архівісты Беларусі атрымалі больш за 200 запытаў. Сёлета з просьбай скласці свае генеалагічныя дрэвы звярнуліся да спецыялістаў грамадзяне Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы, Францыі, Польшчы, Ізраіля, ЗША, Вялікабрытаніі і Данii.**

■ Шчодрыя ападкі ў мінулыя выхадныя сталі прычынай падтаплення прыватных дамоў і прасядання грунту пад шматкватэрным жылым домам у Віцебску. За два дні ў горадзе выпала 40 мм ападкаў, што склала месячную красавіцкую норму.

Фота БЕЛТА

■ **На ўзбраенне мінскага палка патрульна-паставой службы міліцыі паступіла 8 скутэраў кітайскай вытворчасці. Яны будуць выкарыстоўвацца для патрулявання ў лесапаркавай зоне, месцах масавага збору людзей. Яны развіваюць хуткасць да 60 км/гадз. пры мінімальным расходзе паліва — да 2 л на 100 км, мабільныя і маюць добрую праходнасць.**

■ Міністэрства гандлю Беларусі прапануе разгледзець сістэму матэрыяльнага заахвочвання за продаж айчынных тавараў, заявіў міністр гандлю Беларусі Аляксандр Іванкоў. Паводле Мінгандлю, у першым квартале ў таварааабароце гандлёвай сеткі доля айчынных тавараў знізілася на 1,6 працэнтнага пункта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Як лічыць міністр, паправіць становішча можна, калі, напрыклад, увесці сістэму, пры якой аплата працы прадаўца будзе залежаць ад аб'ёму рэалізаванай прадукцыі айчыннай вытворчасці.

■ **Маскоўскія нейрахірургі прышылі безыменны палец правай рукі 21-гадоваму жыхару Мурама Андрэю Лабкову. Палец ён згубіў падчас гульні ў баскетбол, зачапіўшыся за сетку. У Маскву пацярпелы быў дастаўлены верталётам.**

■ За правядзенне незаконнай азартнай гульні на даход аднаго з гомельскіх казіно накладзены арышт. Адміністрацыяй казіно ў канцы мінулага года самавольна былі зменены правілы гульні ў «Рускі покер». На даход ад гульні, атрыманы за час парушэнняў, які склаў больш за 45 тыс. долараў, накладзены арышт.

■ **Учарашні панядзелак, 14 красавіка, жыхары Паўднёвай Карэі адзначаюць як Чорны дзень, які лічыцца Днём усіх незаканаых і адзінокіх. У гэты дзень тыя карэйцы, хто не знайшоў сваю другую палавіну, выказваюць пачуцці талеркай локшыны хуткага прыгатавання і чорным соўсам у кампаніі іншых адзінокіх людзей. Між тым дзень усіх закаханых тут святкуюць, як і паўсюль, 14 лютага.**

Поўны абзац

■ **Улады Інданезіі абавязалі інданезійскіх масажыстак насіць падчас працы замкі цнатлівасці на штанах, каб кліентам масажных салонаў было зразумела, што паслугі сэксуальнага характару ва ўстанове адсутнічаюць. Гэтыя замкі немагчыма зняць. Міністр Інданезіі па справах жанчын Міуца Свасона не лічыць такі спосаб барацьбы з прастытуцыяй правільным. Яна лічыць, што гэта зневажае жанчын. Больш эфектыўным будзе паляпшэнне сістэмы бяспекі, уключаючы ўстаноўку камер.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Адпачынак-2008

«ТУНІСКІ ВАРЫЯНТ» НА... МІНСКІМ МОРЫ

Да пачатку сезона масавых водпускаў засталіся лічаныя тыдні, таму пытанне, дзе ў рэшце рэшт правесці свой адпачынак, становіцца ўсё больш актуальным. Выбар тут быў заўсёды, прычым як за мяжой, так і непасрэдна ў Беларусі. Між тым, колькасць айчынных варыянтаў узрасце менавіта сёлета — шэраг новых і па-сапраўднаму цікавых напрамкаў мае прапанаваць ДУ «ЦэнтрКурорт» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі.

СТУДЭНЦКІЯ КАНІКУЛЫ

Што такое Нарач, ведае ці не кожны беларус. Аднак для тых, хто прыязджаў сюды яшчэ за савецкім часам, варта ўсё ж заўважыць — на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Нарачанскі» з'явіліся сучасная база адпачынку, гасцявыя катэджы, някепская інфраструктура, экалагічныя сцежкі, турыстычныя стаянкі.

Галоўнай адметнасцю сезона-2008 у Нацпарку стане адкрыццё аўтакемпінгу «Нарач». Кемпінг размесціцца на паўднёва-заходнім узбярэжжы найбуйнейшага возера Беларусі за 10 кіламетраў ад курортнага пасёлка. Сам тур разлічаны на пяць дзён, што ж да «раскладкі», то яна будзе даволі інтэнсіўнай. Апроч звычайнага пляжа і лесу, у праграму ўваходзяць некалькі экскурсійных паездак — у Камаі, Паставы, Лучай, агратурыстычны комплекс «Салаўіны гай», Глыбокае і Мосар, Крэва, Баруны, Гальшаны і Смаргонь, Мядзел, Княгінін, Крывічы і Будслаў.

Мяркуецца, што асноўнымі наведвальнікамі кемпінгу стануць школьнікі, навучэнцы і студэнты. Таму кошт тура складзе каля 260 тыс. рублёў на чалавека — з улікам праезду са сталіцы, 3-разовага харчавання і пражывання ў нумарах на 2—3 месцы.

БРАСЛАЎСКІ КРУІЗ

Не менш папулярнай зонай адпачынку традыцыйна з'яўляліся Браслаўскія азёры. Сёлета тут будзе прапаноўвацца так званая «летняя пуцёўка», якая ўключае ў сябе 7—10 дзённае пражыванне, 3-разовае харчаванне, экскурсію ў старажытны Полацк, анімацыйную праграму «У гасцях у Вадзяніка», пракат лодкі і спартыўнага інвентару. Пры гэтым кошт такой пуцёўкі, у залежнасці ад ступені камфорту, у сярэднім будзе вагацца ў межах 180—400 умоўных адзінак на сем ці 300—500 у.а. — на дзесяць дзён.

Плюс да таго, гэтым летам Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» плануе ўпершыню заняцца арганізацыяй лодачных паходаў і прагулак на цеплаходзе. Дарэчы, уласны 2-палубны цеплаход тут набылі спецыяльна да новага сезона.

ТУР З ЧЫРВОНАЙ КНІГАЙ

6 тысяч відаў жывёл, звыш 2 тысяч раслін, цнатлівая прырода. Усё гэта можна знайсці за нейкіх сто кіламетраў ад Мінска — у Бярэзінскім біясферным запаведніку.

Сёлета ў запаведніку распрацаваны спецыяльны батанічны тур, на працягу 9 дзён ёсць шанц па чарзе пазнаёміцца з унікальнай, у тым ліку «чырванакніжнай» флорай сасновага, яловага, лісцевага лясоў, балот, рэк, азёраў і пашы. Кошт тура вызначаны прыкладна ў 150—170 еўра на чалавека. Зноў-такі з поўным пансіёнам. Пры гэтым кожная група мае магчымасць зрабіць індывідуальны заказ — па жаданні «стандартную» батанічную праграму можна як скараціць, так і наадварот павялічыць.

ГЕЙЗЕР ПЛЮС САЛЯНАЯ ПЯЧОРА

Санаторый «Юнацтва», што знаходзіцца на беразе Мінскага мора, найперш быў вядомы лячэннем захворванняў сістэмы кровазвароту, апорна-рухальнага апарату і нервовай сістэмы, а таксама аздараўленчым палатачным гарадком на востраве Кахання. Цяпер тут з'явілася яшчэ адна «разынка» — воднаспартыўны комплекс з абсталяванымі «вадаспадамі» і «гейзерамі», дарослым і дзіцячым басейнамі, спартыўнай і трэнажорнымі заламі, саўнай, рускай і турэцкай лазнямі, масажнымі і касметалагічным кабінетамі, джакузі, салярыем, турбасалярыем, салянай пячорай.

Фота Анатоля КЛЕЦКУКА

Жывёльны свет Бярэзінскага запаведніка пад пільным вокам англійскіх турыстаў.

Калі ж дадаць да гэтага магчымасць абгортвання знакамітымі Сакскімі грязямі, то не выпадае сумнявацца, што пад Мінскам адчыніўся буйны SPA-цэнтр. І не горшы, чым у Тунісе.

ЧАТЫРЫ ДНІ НА ДЗВЕ БАЛТЫЙСКІЯ КРАІНЫ

Кавалак нашай краіны ў «фестывальнай» Юрмале — гэта санаторый «Беларусь». Санаторый спецыялізуецца на лячэнні захворванняў эндакрыннай сістэмы, сістэм стрававання і кровазвароту, парушэнняў абмену рэчываў. Але «паўночны напрамак» цікавы не толькі гэтым. Да адметных прапаноў новага сезона варта аднесці «экскурсіёнку» па маршруце Мінск—Стакгольм—Рыга—Сігулда—Юрмала. З паездкай па Балтыцы на пароме, наведваннем Каралеўскага палаца, ратушы, кафедральнага сабора і дома Нобеля ў сталіцы Швецыі, Сігулдскага і Турайдскага замкаў, пячоры Гутмане і аднаго з найбуйнейшых у Еўропе аквапаркаў на тэрыторыі Латвіі.

Кошт тура вызначаны ў 190 еўра, у гэтую суму ўваходзяць праезд, пражыванне, транспартнае абслугоўванне, экскурсійнае абслугоўванне ў Стакгольме, афармленне візы. Дадатковыя выдаткі — кошт самой візы, вячэра і сняданак на пароме, абед у «Лідо», наведванне аквапарку, страхоўка і паліўны збор.

«СІЛІЧЫ» НЕ ТОЛЬКІ ЎЗІМКУ

Калі мы называем «Сілічы» беларускім гарналыжным цэнтрам, то кажам праўду. А вось калі лічым, што працуе ён толькі ўзімку — памыляемся. Прынамсі, пераканаць у гэтым можа чарговая навінка, праграма «Беларускія канікулы — 7 дзён у цэнтры Еўропы» ці своеасаблівае спалучэнне знаёмства з турыстычнымі адметнасцямі, актыўнага адпачынку і аздараўлення ў лепшых санаторыях краіны.

Апроч харчавання, пражывання і карыстання ўсёй інфраструктурай «Сілічаў», у «меню» тура ўваходзяць паездкі ў Бярэзінскі біясферны запаведнік, SPA-цэнтр санаторыя «Юнацтва», санаторый «Баравое», экскурсіі па Мінску, Полацку, Хатыні і комплексу «Лінія Сталіна». Варта адразу заўважыць, што поўная цана праграмы немаленькая — 490 долараў. Разам з тым, лічаць у «ЦэнтрКурорце», прапанова беларускіх канікулаў павінна зацікавіць не толькі гасцей нашай краіны. Тым больш, што тур можа быць наладжаны ўсяго для 2—3 чалавек, і сам па сабе гэты факт ніяк не адаб'ецца на кошце. Адзіным адрозненнем для невялікай групы можа быць хіба што прадстаўленне аўтатранспарту крыху меншай умяшчальнасці.

Сяргей ГРЫБ.

Галоўны рэсурс краіны — добрасумленная паўсядзённая праца

Аб гэтым сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь Нявыглас, уручаючы спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі кіраўніка дзяржавы.

Ён павіншаваў з заслужанымі ўзнагародамі вялікую групу будаўнікоў Беларускага металургічнага завода, якая плённа папрацавала на будаўніцтве новага трубаправоднага комплексу. За ўзорнае выкананне працоўных абавязкаў і высокія паказчыкі ў будаўніцтве важных дзяржаўных аб'ектаў таксама ўшаноўвалі работнікаў навукова-вытворчай арганізацыі «Эльвіра», замежнага прадпрыемства «Ісакідыс Гранітэс», ТАА «Аслябя», «Трайпл», вытворчага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Джэвет», ТАА «Таір Інтэркул Компані», «Мінскзялёнбуда», «Рэалкамбуда».

Кіраўнік Адміністрацыі адзначыў працу работнікаў Галоўнага ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, кіраўнікоў і спецыялістаў шэрагу дзяржаўных органаў. За якаснае медыцынскае абслугоўванне, пастаянную ўвагу і сардэчныя адносіны да пацыентаў адзначаны калектыў работнікаў Іжскай бальніцы сястрынскага догляду Вілейскай цэнтральнай раённай бальніцы. Падзякі Прэзідэнта за высокае прафесійнае майстэрства, значны ўклад у развіццё адукацыі і выхаванне падрастаючага пакалення ўдастоены работнікі адукацыі і культуры. У прыватнасці, супрацоўнікі Уздзенскай дзяржаўнай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы № 1 імя А.С. Пушкіна, Нацыянальнага дзіцячага аздараўленчага лагера «Зубраня», Барысаўскай цэнтралізаванай бібліятэкі.

БЕЛТА.

Здайце зброю і спіце спакойна!

У Мінску пачалася спецыяльная аперацыя «Арсенал»

Сталічныя міліцыянеры будуць правяраць аб'екты, дзе захоўваецца зброя, а таксама ўладальнікаў прыватных «арсеналаў». Зразумела, што будзе актывізаваная праца і па выяўленні незарэгістраваных «стваловў», падпольных сховішчаў боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. З пачатку гэтага года ў сталіцы праваахоўныя органамі былі канфіскаваны 42 адзінкі зброі і амаль 1,5 тысячы патронаў і іншых боепрыпасаў. Разам з тым мінчане добраахвотна здалі сёлета 263 адзінкі зброі. Асобы, якія добраахвотна развітваюцца з небяспечнымі прыладамі, вызваляюцца ад адказнасці. А вось грамадзянам, якія незаконна захоўваюць зброю, боепрыпасы і выбуховыя рэчывы, пагражае пакаранне – пазбаўленне волі на тэрмін да 6 гадоў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Небяспечная сустрэчная паласа

30-гадовая жыхарка сталіцы, якая знаходзілася за рулём «Форда», ноччу ў Дзяржынскім раёне сутыкнулася на дарозе з аўтамабілем «Сітраен» пад кіраваннем 31-гадовага начальніка аддзела філіяла аднаго з банкаў са Стоўбцаў. Гэта каштавала жыцця абодвум вадзіцелям, а яшчэ адзін пасажыр «Форда» трапіў у бальніцу. А вось у выніку дарожна-транспартнага здарэння паблізу вёскі Мецявічы Салігорскага раёна ў бальніцу трапілі адразу пяць чалавек — кіроўцы двух аўто і тры пасажыры.

Ігар ГРЫШЫН.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ
Открытого акционерного общества
«ЭЛЕМА»
Адрес: 220033, г. Минск, ул. Тростенецкая, 5

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2008 г. *млн руб.*

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	10312	10977
Нематериальные активы	120	5	4
Вложения во внеоборотные активы	140	177	401
ИТОГО по разделу I	190	10494	11382
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	20940	25135
В том числе: сырье, материалы, другие активы	211	5279	5001
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	1158	838
расходы на реализацию	214	148	175
готовая продукция и товары для реализации	215	10062	13426
товары отгруженные	216	3868	5169
расходы будущих периодов	218	160	204
прочие запасы и затраты	219	265	322
Налоги по приобретенным активам	220	1073	1183
Дебиторская задолженность	230	1482	1364
В том числе: покупателей и заказчиков	231	858	688
поставщиков и подрядчиков	232	61	76
разных дебиторов	233	225	222
прочая дебиторская задолженность	234	338	378
Денежные средства	250	364	465
Финансовые вложения	270	67	68
Прочие оборотные активы	270	797	793
ИТОГО по разделу II	290	24723	29008
БАЛАНС	300	35217	40390
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	537	537
Резервный фонд	420	851	1039
В том числе: резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	851	1039
Добавочный фонд	430	11128	12412
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	9527	11687
ИТОГО по разделу III	490	22043	25675
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	520	1859	1769
Кредиторская задолженность	530	11315	12945
в том числе: перед поставщиками и подрядчиками	531	9867	11206
перед покупателями и заказчиками	532	345	309
по оплате труда	533	568	684
по расчетам с персоналом	534		2
по налогам и сборам	535	268	537
по социальному страхованию и обеспечению	536	180	154
разных кредиторов	537	87	53
Резервы предстоящих расходов	550		1
ИТОГО по разделу IV	590	13174	14715
БАЛАНС	600	35217	40390
Краткосрочная кредиторская задолженность	602	11315	12945
Материалы, принятые в переработку	003	920	731
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	1761	2015
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	13	13
Потеря стоимости основных средств	014	193	198

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2007 г. по 31 декабря 2007 г.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	70587	59793
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	8411	6761
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	62146	53032
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	50026	43181
Расходы на реализацию	050	3808	2878
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050)	060	8312	6973
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	25265	21350
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071	19	23
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	25246	21327
В том числе: от выбытия основных средств и нематериальных активов	082	9	27
прочие операционные доходы	083	25237	21300
Операционные расходы	090	25318	21410
В том числе: от выбытия основных средств и нематериальных активов	092	2	29
прочие операционные расходы	093	25316	21381
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (080-090+/-110)	120	-72	-83
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	226	124
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	226	124
курсовые и суммовые разницы	142	95	66
прочие внереализационные доходы	144	131	55
Внереализационные расходы	150	2894	2861
В том числе: от списания дебиторской задолженности	151		4
курсовые и суммовые разницы	152	668	489
безвозмездно переданные активы (включая денежные средства)	153	13	23
прочие внереализационные расходы	154	2213	2345
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-2667	-2737
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+/-120+/-160)	200	5573	4153
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	1820	1396
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	10	48
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)	240	3743	2709

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПО СОСТОЯНИЮ на 01 января 2008 г.

Количество акционеров — 2446, в том числе физических лиц — 2446.

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	21	16
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	40	30
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	47,817	40,2
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	447	383
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	762	1268

Среднесписочная численность работающих (человек) — 1475.
Основной вид деятельности — производство верхней одежды.

Директор Л.И. Шавель
Главный бухгалтер С.Н. Хадаркевич

УНП 100074549

Пытальнік

ЦІ МОЖНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ПАДСАДНЫХ КАЧАК?

Па спецыяльнасці я біёлаг-паляўнічтвазнаўца, працую ў Шацкай ваеннай паляўнічай гаспадарцы ўжо 30 гадоў. Апошнія гады — на пасадзе егера. 23 сакавіка мне патэлефанаваў паляўнічы І.І. Парфёнак з п. Праўдзінскі і паведаміў, што меў размову з абласной інспекцыяй па ахове прыроды і навакольнага асяроддзя. Яго папярэдзілі, што калі ён выйдзе на паляванне з падсаднымі качкамі, не маючы на тое дазволу ад Мінпрыроды, дык атрымае штраф. Мяне гэта паставіла ў поўны тупік. Падсадныя качкі не адносяцца да дзікіх птушак. Гэта ж хатняя птушка, якой яшчэ 300 гадоў таму была падмешана кроў дзікай качкі і шляхам падбору лепшых галасоў, афарбоўкі і іншых характарыстык выведзена парода падсадных качак для палявання на качараў.

Падсадныя качак І.І. Парфёнак набыў у мяне яшчэ 8 гадоў таму, а я, у сваю чаргу, купіў пару для развядзення ў Любанскай гаспадарцы 20 гадоў таму (а яны завезлі іх з Тульскай вобласці). Затым для абнаўлення крыві я купіў качара з Валагодскай вобласці... Маіх падсадных качак набывалі паляўнічыя і егеры з Брэсцкай, Гродзенскай, Гомельскай і Мінскай абласцей. Справа ў тым, што раней паляванне вясной на качара было забаронена і падсадных качак засталіся адзінкі. У кнізе ра старажытнае паляванне ў Беларусі апісваецца, што за добрую падсадную качку паляўнічаму маглі даць карову.

Што ж адбываецца цяпер? Няўжо паляўнічаму патрэбна ехаць з качкай у Мінпрыроды, а там вызначаць: дзікая гэта качка ці падсадная крыжанка?.. Дарэчы, з 5 красавіка адкрылася веснавое паляванне на качара і ўсе паляўнічыя хочуць атрымаць адказ на гэта пытанне.

Валерый Канстанцінавіч ЯСКЕВІЧ, в. Сяргеевічы Пухавіцкага раёна.

Адразу заўважым, што інспекцыі з дакладна такой назвай, як указаў чытач, не існуе. А што па сутнасці пытанняў... Літаральна за паўдня мы абзванілі як мінімум з паўтузіна розных спецыялістаў з Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Імкнуліся зрабіць усё хутчэй, бо з 5 красавіка (па 11 мая) павінен распачацца сезон паляванння на качараў дзікіх качак з засады з падсаднымі качкамі, чучаламі і вабікамі і на вальдшнэпа на цязе. Аднак ніводзін суразмоўца ні пра якія змяненні ў дачыненні да выкарыстання падсадных качак (ці, як піша чытач, атрымання дазволу на іх выкарыстанне) не чуў. Адзіная ўскосная «зачэпка» — калі гаворка ідзе пра здабытую дзікую качку, якую збіраюцца выкарыстоўваць у якасці падсадной. На тое існуюць спецыяльныя правілы вымання дзікай жывёлы з прыроды, аднак гэта яўна не наш выпадак, паколькі заяўнік сам піша: падсадныя качкі не адносяцца да дзікіх птушак. А ў вышэйагучаную вытрымку з Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванння апошнім часам ніякіх дапаўненняў і змяненняў не ўносілася.

Купляй сваё!

ПІВА НАШАГА ГОНАРУ

Першым уладальнікам унікальнай для айчыннага піўнога рынку бутэлькі з рэльефным лагатыпам — эмбосінгам (англ. embossing — «чаканка») стала піва «Аліварыя Экстра» ААТ «Піўзавод Аліварыя».

Паводле слоў кіраўніцтва завода, новы дызайн праводзіць гістарычную паралель з глыбокімі традыцыямі старэйшага піўнога завода Беларусі, пакольк з 1898 года і да 1917-га завод, які належаў на той час аўстрыйскім купцам, братам Лекертам, разліваў піва ў шклянныя бутэлькі з рэльефнай чаканкай. Рысы старажытнай бутэлькі «Царскага піва» Франца Лекерта былі пакладзены ў аснову інавацыйнай упакоўкі «Аліварыя Экстра».

У красавіку, акрамя новай эстэтыкі бутэлькі вышэйпамянёнага гатунку піва, спажыўцы змогуць ацаніць і абноўлены знешні выгляд этыкетак такіх гатункаў, як «Залатое», «Безалкагольнае», «Моцнае», «Траецкае», «Дзесятка», «DATA 1864», «Бровар». У этыкетках выкарыстаны сучасныя шрыфты, новыя спалучэнні колераў і новы слоган — «Піва нашага гонару». Над усім гэтым папрацавала галандская кампанія «Класэнс», вядучы сусветны кансультант гандлёвых марак у галіне стварэння сучасных арыгінальных упаковак. Дызайнерскае агенцтва мадэрнізавала і лагатып ААТ «Піўзавод Аліварыя». Выява арла ў графічным знаку як сімвал лідарства і мужнасці набыла заўважную дынаміку.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Мірны закат айчыннага тэніса?

Тэніс. Кубак Дэвіса

Фота БЕЛТА.

Мінулыя выхадныя, улічваючы пятніцу, многія айчынныя балельшчыкі вялікага тэніса могуць лічыць пачаткам мірнага закату беларускага тэніса. Пэўна, што яны маюць рацыю. Калі пройгрыш у папярэднім матчы плей-оф Кубка Дэвіса ў Перу (1:4) можна было спісаць на залішні тэмперамент паўднёваамерыканцаў і поўную адсутнасць культуры мясцовых гледачоў і абыякавасць арбітраў, якія бясконца засвісталі і засуджвалі каманду Мірнага і К, то паражэнне дома з такім жа лікам у матчы другога круга першай Еўра-Афрыканскай групы ад швейцарцаў, якія выступалі без свайго лідара Роджэра Федэрэра, трэба ўспрымаць як знак таго, што нам трэба спусціцца з неба на зямлю. І гэта вельмі шкада, бо сапраўдныя аматары вялікай ракеткі памятаюць: шлях беларусаў у Сусветную групу з самых нізоў заняў без малога дзесяць гадоў. Пачынаць даводзілася з экзатычных краін у Афрыцы, накшталт Беніна і Тога...

Магчыма, я залішне згушчу фарбы, і патэнцыял беларусаў проста «дрэмле». Між тым на заключнай пасляматчавай прэс-канферэнцыі той жа Валодзя Валчкоў даў журналістам зразумець, што ён з Максімам Мірным у далейшым мог бы камандзе дапамагаць, гуляючы ў пары. Маўляў, час ужо адпачыць яго арганізму ад высокіх перагрузак у адзіночных матчах і ўступіць дарогу маладым. Ці ёсць у нас дастойная лаўка запасных з разраду падрастаючага пакалення? Уладзімір Ігнацік, якому пакуль толькі 17 гадоў, паказаў, што ён не лыкам шыты. Праўда, яго гераічны паядынак з лідарам гасцей Станіславам Ваўрынкам, дзе перамог вопыт — швейцарац выйграў 4:1, быў пераплецены з невыразным выступленнем у заключным паядынку з Івам Алегра, які старэйшы за Ігнаціка на цэлае дзесяцігоддзе і займаў месца ў бягучым рэйтынгу ATP аж у дзевятай сотні, што на дзвесце радкоў ніжэйшае, чым у юнага беларуса. Але ж не знайшлося... Гэта пры тым, што тэкставе ўпамінанне пра артыста, паводле слоў складальнікаў, было бясплатным, грошы плацілі толькі тыя, хто хацеў размясціць сваё фота, вялікую рэкламу і г.д.

— Чаму артысты, вядомыя далёка за межамі краіны, не трапілі ў даведнік — гэта было не цікава ім ці вам? — спыталіся мы ў гендырэктара выдавецтва «Мэджык» Юрыя Будзько.

— Мы звязваліся з агентамі некаторых — Анжэлікі Агурбаш, «Merry Poppins», «Ляпіса Трубецкого». Але яны збольшага працуюць не ў Беларусі, не на наш рынак, таму ім гэта не надта цікава.

Затое цікавасць «трапіць у шоўбізнэс», калі верыць даведніку, выказалі Аліна, Ангеліна, Берта, «Лос Пердзідос» (не падумайце дрэнна — гэта брэсцкі барабанны гурт), яшчэ мноства артыстаў, якіх ніхто ніколі не бачыў і не чуў. І ўсе аддзелы культуры райвыканкамаў, ад Баранавічаў да Шуміліна. Акрамя выканаўцаў і калектываў, прадзюсараў і арганізатараў канцэртаў, на старонкі трапілі пастаўшчыкі сумежных паслуг (гук, святло, салоны прыгажосці, фота, мода і г.д.), гандлёвыя пункты, музычныя школы і студыі, канцэртныя пляцоўкі, СМІ (аж 10 газет, напрыклад), шэраг фестываляў і некаторыя нарматыўныя акты з артыстычнай сферы. Больш за тое, у студзені гэтага года будзе прадстаўлены новы, дапоўнены і пашыраны даведнік «Шоў-бізнэс у Беларусі. 2009» і зборнік кароткіх аўтабіяграфій «Хто ёсць хто ў беларускім шоў-бізнэсе». Плюс рэсурс у Інтэрнэце аб'яднае інфармацыю з абодвух даведнікаў. Тэарэтычна, па версіі складальнікаў, трапіць у яго можа кожны, хто хоць раз «засвяціўся» на сцэне і з'явіўся ў эфіры або на старонках СМІ. А практычна — не ўсё тое шоў-бізнэс, што гучыць і ставіцца на сцэне. Пакуль

Прыкладна так, калі верыць даведніку, выглядае айчынны шоў-бізнэс.

швейцарская каманда прыйшла ў поўным складзе ў надзвычай добрым настроі. Сваю перамогу яны планавалі адзначыць і з дапамогай беларускай гарэлкі. «Матч з беларускай камандай мы выйгралі б у любым выпадку, — сказаў капітан гасцей Севярын Люцін, — нават калі б у чацвёртым сэце Ваўрынка ўступіў бы Валчкову...»

Асабіста ў мяне не было падстаў не верыць ураджэнцу Берна, які ў свой час быў партнёрам па спарынгу Роджэра Федэрэра і Марціны Хінгіс.

Паводле папярэдніх даных, наступны матч у першай Еўра-Афрыканскай групе нашы правядуць 18—20 ліпеня 2008 года ў Мінску з камандай Польшчы. Ці будуць ужо ў гэтым паядынку кардынальныя змены з баявым складам? Магчыма. Аднак на гэтае пытанне журналістаў капітан беларускай каманды Дзмітрый Татур не адказаў.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Спорт-тайм

Лідзіруе «Нафтан»

Паводле вынікаў матчаў другога тура чэмпіянату Беларусі па футболе ў вышэйшай лізе ў лідары выйшаў наваполацкі «Нафтан». У Гродне іграклі Ігара Кавалевіча перамаглі «Нёман» (2:1), які ўзначальвае экс-трэнер «Нафтана» Вячаслаў Акшаеў.

У Жодзіне дзеючыя чэмпіёны краіны барысаўскі БАТЭ і мясцовае «Тарпеда» згулялі ўнічыю (0:0). Нулявая нічыя таксама зарэгістравана і ў Віцебску, дзе аднайменны клуб сустрэўся са сталічным «Лакаматывам». Не вызначылі мацнейшага магілёўскі «Днепр» і салігорскі «Шахцёр» (2:2). У процістаянні мінскіх «Дынама» і МТЗ-РІПА выйгралі «бела-блакітныя» (2:0). З такім жа лікам завяршыўся матч «Гомель

Открытое акционерное общество «Постторг»

выкупает простые (обыкновенные) акции собственного выпуска в количестве 15 000 штук по цене 10 000 (десять тысяч) рублей за одну акцию с целью их аннулирования.

Предложения о продаже акций принимаются с 15 по 28 апреля **по адресу: г Минск, ул. Клумова, 3, комн. 21. Ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Разъяснения по данному вопросу можно получить по телефону: 230 31 94 в указанное время.

УНП 100036531

Спрошчаны парадак выдачы візаў

Як паведамілі ў МЗС краіны, значна спрашчаецца парадак афармлення аднаразовых і двухразовых візаў для іншаземных турыстаў. Ім ужо не трэба прадастаўляць у консульскія ўстановы Беларусі за мяжой арыгінал турыстычнага ваўчара. Цяпер замежнаму турысту, каб атрымаць беларускую візу, дастаткова прадставіць адзін з наступных дакументаў: **афармленае адпаведным чынам хадайніцтва беларускай турыстычнай фірмы; хадайніцтва санаторна-курортнай ці аздараўленчай арганізацыі; хадайніцтва грамадзяніна Беларусі і копія яго дакумента на дазвол займацца паслугамі ў сферы аграгурызму.**

У асобных выпадках візу мае права адкрыць беларускі консул па свайму рашэнню. Як паведамілі ў МЗС, для грамадзян Еўрасаюза, ЗША, Канады, Японіі і шэрагу іншых краін можа быць прынята і паслужыць падставай для выдачы візы копія дакумента.

Леанід ТУГАРЫН.

МГТС «БЕЛТЭЛЕКОМ» З 14 ПА 23 КРАСАВІКА ПРАВЯДЗЕ РАБОТЫ ПА ПЕРАКЛЮЧЭННІ АБАНЕНТАЎ СА ЗМЯНЕННЕМ НУМАРАЦЫІ

У сувязі з пераключэннем абанентаў на электронную АТС нумарацыя зменіцца наступным чынам: тэлефонныя нумары 238-10-00 — 238-10-99 будуць заменены на 246-10-00 — 246-10-99, 238-13-00 — 238-20-99 на 246-13-00 — 246-20-99, 238-60-00 — 238-69-99 на 246-60-00 — 246-69-99, 238-70-00 — 238-70-99 на 246-70-00 — 246-70-99, 238-72-00 — 238-72-99 на 246-72-00 — 246-72-99, 238-75-00 — 238-76-99 на 246-75-00 — 246-76-99 і 238-78-00 — 238-79-99 на 246-78-00 — 246-79-99.

Пасля завяршэння пераключэння на старыя нумары будзе ўстаноўлены аўтаінфарматар, які будзе паведамляць парадак набору нумара. У далейшым усе абаненты будуць мець доступ да дадатковых відаў абслугоўвання электронных АТС.

БЕЛТА.

Минский городской центр недвижимости

ТЕКСТ ИЗВЕЩЕНИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ:

ОАО «Криница» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже расположенных в г. Минске по ул. Горецкого, 27 встроенно-пристроенных помещений кафе-бара общей площадью 716 кв.м и иного имущества, в том числе:

№ п/п	Наименование	кол-во
1.	Блендер электрический	1
2.	Ванна моечная	1
3.	Ведро	5
4.	Ведро 10 л. б/кр	1
5.	Ведро н/ст 8 л	1
6.	Ведро п/м 10 л с кр.	3
7.	Вентилятор ВО-6-300	1
8.	Вентилятор ВТ 16	1
9.	Вентилятор напольный	2
10.	Весы ВНЦ-2М	2
11.	Весы ВЭУ 2	1
12.	Весы РП-100	1
13.	Ветка елочная	3
14.	Ветка елочная	2
15.	Вьюн зел. мал.	13
16.	Гастропосуда GN 1/4-150	10
17.	Горшок пластиковый 9В 140	3
18.	Декоративное ограждение	40
19.	Держатель д/тр. 35 см	1
20.	Держатель Торк д/мини полотенец зигзаг бел.	2
21.	Держатель Торк д/туалет. бумаги в мини рулон. бел.	1
22.	Дозаторы	12
23.	Доска гладильная	1
24.	Дуршлаг ал.	1
25.	Елка	1
26.	Елка искусственная Р 15213	1
27.	Жалюзи вертикальные	8,02
28.	Занавес д/душа	1
29.	Занавес д/мал. бол. желтая	6
30.	Занавес для пив. зала желт.	5
31.	Занавес для хола желт.	2
32.	Занавес для хола цв.	2
33.	Зеркало	1
